Конкурс па беларускай мове
**“БУСЛІК-2008”**

*Чацвер, 21 лютага 2008 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 9-10(12) класаў

**1.** Знайдзіце ў пераблытаных літарах адгадку на загадку:
*Галубачка белая ў хату заляцела, а дзе і што сустракала, пра ўсё расказала.*
**А)** а, т, г, е, а, з. **Б)** а, с, д, с, к, е, у. **В)** а, т, к, а, ў, ш, п, о.
**Г)** а, л, ы, а, с, п, к. **Д)** а, р, к, о, с, а.

**2.** Выберыце з прыведзеных сказаў толькі двухсастаўныя неразвітыя:
*1) Чомга – невялікая птушка.*
*2) Яна крыху большая за качку.*
*3) У яе невялікая галава з тонкай і вострай дзюбай на канцы.*
*4) На галаве ззаду пучкі пер’я, нібы чорныя рожкі ці вушкі.*
*5) Шыя доўгая, гнуткая. (Паводле В. Вольскага)*
**А)** 1, 5. **Б)** 2, 4. **В)** 3, 4. **Г)** 5. **Д)** няма варыянтаў.

**3.** У беларускім алфавіце шаснаццатае месца займае літара:
**А)** і. **Б)** о. **В)** л. **Г)** у. **Д)** р.

**4.** Што патрэбна ўставіць замест пропуску ў наступных словах:
*1) двух..ярусны; 2) сузор..е; 3) пад..ёмнік; 4) п..яўка; 5) двукроп..е; 6) узмор..е.*
**А)** літару ***ы***. **Б)** літару ***і***. **В)** апостраф.
**Г)** злучок. **Д)** раздзяляльны мяккі знак.

**5.** Колькі мяккіх зычных ужыта ў вершаваных радках П. Броўкі?
*Слаўлю я свой край любімы,*
*Незгасальную зару.*
*Як ты сэрцу майму міла,*
*Дарагая Беларусь.*
**А)** 10. **Б)** 12. **В)** 14. **Г)** 15. **Д)** 16.

**23.** У рускай мове ёсць выраз: *пронизывающий ветер, сопровождающийся характерным звуком*. Як называецца па-беларуску такі вецер у народзе?
**А)** скавыш. **Б)** вожаг. **В)** віскуцень. **Г)** вітка. **Д)** вяршняк.

**24.** Каму з беларускіх пісьменнікаў належыць літаратурны псеўданім *Навум Прыгаворка*?
**А)** Якубу Коласу. **Б)** У. Дубоўку. **В)** Ф. Багушэвічу.
**Г)** В. Дуніну-Марцінкевічу. **Д)** Я. Баршчэўскаму.

**25.** У якіх словазлучэннях прыметнікі напісаны няправільна?
*1) Матчына дабрыня; 2) надзіна дапамога; 3) прыгожыя плошчы;*
*4) пчаліны рой; 5) Міхаліціна думка.*
**А)** ва ўсіх словазлучэннях. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 1, 2, 5. **Д)** 3, 4.

**26.** У 2005 годзе ў Брэсце быў адкрыты помнік работы Алеся Гурщчанкава і Паўла Герасіменкі вядомаму беларускаму пісьменніку-палемісту, грамадскаму, палітычнаму і царкоўнаму дзеячу XVII стагоддзя …
**А)** Лаўрэнцію Зізанію. **Б)** Лявонцію Карповічу. **В)** Казіміру Лышчынскаму.
**Г)** Іпацію Пацею. **Д)** Афанасію Філіповічу.

**27.** Што называюць ***беларускім морам***?
**А)** Браслаўскія азёры. **Б)** возера Нарач. **В)** раку Нёман.
**Г)** возера Свіцязь. **Д)** возера Лукомскае.

**28.** Каму з беларускіх мастакоў слова належыць вольны пераклад твора «Слова пра паход Ігаравы» на беларускую мову?
**А)** М. Гарэцкаму. **Б)** Янку Купалу. **В)** Я. Крупеньку.
**Г)** Р. Барадуліну. **Д)** К. Чорнаму.

**29.** Беларускі і польскі драматург, асветнік XVIII стагоддзя Каятан (Каэтан) Марашэўскі напісаў твор, які і сёння лічыцца найбольш значным помнікам беларускага пісьменства XVIII стагоддзя. Якую назву меў твор?
**А)** «Шляхціц Завальня». **Б)** «Камедыя». **В)** «Ідылія».
**Г)** «Энеіда навыварат». **Д)** «Праметэй».

**30.** Хто з беларускіх мовазнаўцаў пачатку XX стагоддзя акрэсліў асноўныя праблемы лінгвагеаграфіі, якія і сёння застаюцца актуальнымі?
**А)** А. Р. Мурашка. **Б)** М. В. Бірыла. **В)** Ю. Ф. Мацкевіч.
**Г)** П. А. Бузук. **Д)** М. А. Паўленка.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail:*
*info@bakonkurs.org*
*http://www.bakonkurs.org/*

ГА «БА «Конкурс». Заказ 12. Тыраж 20600 экз. г. Мінск. 2008 г.

**6.** Падбярыце з прыведзеных слоў сінонім(-ы) да слова ***адчай***: *1) самастойнасць; 2) безвыходнасць; 3) гераізм; 4) няволя; 5) безнадзейнасць; 6) роспач.*

**А)** няма сінонімаў. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 5, 6. **Г)** 4, 5. **Д)** толькі 6.

**7.** Вызначце правільны адпаведнік да рускай фраземы *«за тридевять земель»*:

*1) даганяй ветру ў полі;* *2) ні пылу ні следу;*
*3) за блізкім светам;* *4) за лыжку яды сем вёрстаў хады;*
*5) даць лататы;* *6) за вялікімі барамі, за глыбокімі вадамі;*
*7) як назаўтра трэба.*

**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 7. **Г)** 3, 6. **Д)** 5.

**8.** Дадзены словы: *1) н**а**крыўка; 2) падр**а**ны; 3) ціх**е**нечка; 4) ф**а**рфор; 5) л**а**тунь; 6) упр**ы**куску.* У якіх з іх правільна выдзелены націскны галосны?

**А)** усе словы. **Б)** 1, 4, 5. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 4, 7. **Д)** 3, 4, 5.

**9.** Колькі знакаў прыпынку патрэбна паставіць у сказе: *Пастаяўшы адзін за адным узнімаліся яны (буслы) угару кружыліся там і кожны круг падымаў іх усё вышэй і вышэй.* (Паводле Якуба Коласа)

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**10.** У якіх словах з прыведзеных паставіце замест пропуску злучок?

*1) там_сям;* *2) як_нія к;* *3) далёкае_блізкае;*
*4) баба_яга;* *5) абы_як;* *6) зноў_такі;*
*7) кілават_гадзіна;* *8) з_па_над;* *9) мы_то.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** 1, 6. **В)** 3, 7. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 8, 9.

**11.** Вызначце, у якім(-іх) сказе(-ах) з прапанаваных няправільна падкрэслены дзейнік:

*1) Прыгажосць вакол.*
*2) Там людзі.*
*3) Хлопчык з дзядулем налавіў у той дзень шмат карасёў і шчупакоў.*
*4) Казкі здаўна перадаваліся ў народзе з вуснаў у вусны.*

**А)** няма памылак. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Закончыце народнае выслоўе: *Не адцягнеш, як ката ад …*

**А)** мышы. **Б)** цацкі. **В)** печы. **Г)** хаты. **Д)** тэлевізара.

**13.** Дадзены словы: *1) дзьмуць; 2) дзьвюх; 3) цьмяны; 4) калісьці; 5) дзьмухавец; 6) вязьмо; 7) вядзьмак; 8) ганьбіць; 9) вусьце.* У якіх словах памылкова напісаны мяккі знак?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 9. **Г)** 3, 6, 7, 8, 9. **Д)** толькі 9.

**14.** Назоўнік ***канфуз*** мае значэнне – *‘няёмкае выпадковае здарэнне, якое выклікае збянтэжанасць, сорам; стан няёмкасці, збянтэжанасці, сораму’.* Як правільна сказаць пра чалавека, які лёгка бянтэжыцца, сарамлівы? Выберыце правільны варыянт з прыведзеных: *1) канфузны;* *2) канфузісты;* *3) канфузлівы.*

**А)** усе варыянты. **Б)** 1, 3. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**15.** У народзе пра гэта свята казалі: *«Святы ... накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам».* Выберыце патрэбнае слова.

**А)** Юр’я. **Б)** Багач. **В)** Пакроў. **Г)** Марцін. **Д)** Сцяпан.

**16.** *Перад навагоднімі святамі вучні стараліся набыць пэўныя касцюмы, таму што вельмі хацелі пайсці на ... баль.*
Выберыце з прапанаваных патрэбнае слова, якога не хапае на месцы пропуску ў сказе:

*1) касцюмерны;* *2) касцюміраваны;* *3) касцюмны.*

**А)** няма патрэбнага слова. **Б)** усе словы падыходзяць. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**17.** Якое ўстойлівае спалучэнне мае значэнне *‘мець намер вярнуцца да ранейшага, прывычнага, свайго’*?

**А)** з’есці пуд солі. **Б)** у лес глядзець. **В)** мая хата з краю.
**Г)** на цугундар браць. **Д)** ля разбітага карыта.

**18.** Вучням неабходна было вызначыць у прапанаваных прыказках агульную колькасць слоў з прыстаўнымі гукамі:

*1) Навука хлеба не просіць.*
*2) Бачыць вока, але ляжыць высока.*
*3) На вуснах мёд, а на сэрцы лёд.*

Які, на вашу думку, павінен быць правільны адказ?

**А)** няма ў сказах слоў з прыстаўнымі гукамі. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**19.** Выберыце з прыведзеных толькі словазлучэнні, у якіх ужыты непераходныя дзеясловы:

*1) сустрэцца з аднакласнікамі;* *2) змагацца за мір;*
*3) берагчыся ад хваробы;* *4) купацца ў возеры;*
*5) сачыць за падзеямі.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** усе, акрамя 5. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**20.** У 1909 годзе ў Пецярбургу было надрукавана «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Хто з’яўляецца аўтарам гэтай кнігі?

**А)** Цётка. **Б)** Максім Багдановіч. **В)** Якуб Колас.
**Г)** Алесь Гарун. **Д)** Цішка Гартны.

**21.** Дадзены лічэбнікі: *1) трэці; 2) дзевяцьтысячны; 3) чатырохсоты; 4) дзевяноста чацвёрты; 5) пяць тысяч сёмы.* Які парадкавы лічэбнік запісаны няправільна?

**А)** усе парадкавыя лічэбнікі запісаны правільна. **Б)** 1, 3, 4, 6.
**В)** 2. **Г)** 2, 4, 5, 6. **Д)** 5.

**22.** Калі ўпершыню з’явіўся ў старажытнай беларускай літаратуры тэрмін ***верш***?

**А)** на пачатку XIV стагоддзя. **Б)** на пачатку XV стагоддзя.
**В)** на пачатку XVI стагоддзя. **Г)** на пачатку XVII стагоддзя.
**Д)** на пачатку XVIII стагоддзя.